**НОВІКАЎ С. Я., кандыдат гістарычных навук, дацэнт**



**Рэцэнзент ЗАГОРСКІ Б. І., кандыдат гістарычных навук, дацэнт МДЛУ**

# Сучасная гістарычная навука Германіі аб акупацыі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны

Гістарыяграфія ФРГ праз 55 гадоў пасля заканчэння другой сусветнай вайны вызначаецца шэрагам адметнасцей тэарэтычнага, метадалагічнага і практычнага кшталту. Прагрэс сучаснай германскай гістарычнай навукі з'яўляецца лагічным вынікам імкнення нямецкіх даследчыкаў пераадолець штучныя абмежаванні ў дакументальным, фактычным, навуковым матэрыяле і руху наперад па шляху яго крытычнага вывучэння ў адпаведнасці з узроўнем еўрапейскай і сусветнай навукі. У гэтым кантэксце аўтар артыкула спрабуе, з аднаго баку, выявіць ступень вывучанасці ў замежнай гістарыяграфіі такой тэмы, як акупацыйны рэжым у Беларусі (1941—1944 гг.), а з другога, — пазнаёміць беларускіх чытачоў, перш за ўсё спецыялістаў у вобласці гістарыяграфіі, айчыннай гісторыі і крыніцазнаўства, з сітуацыяй у сучаснай германскай гістарычнай навуцы.

Нямецкамоўная гістарычная літаратура 90-х гг. XX ст. дакладна вызначае месца, ролю і значэнне беларускай тэматыкі сярод іншых навуковых напрамкаў, над распрацоўкай якіх і па сёння актыўна працуюць розныя даследчыя цэнтры і ўстановы, асобныя гісторыкі Германіі [1]. Так, супрацоўнікі Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме — *Рольф-Дзітэр Мюлер і Герд Р. Юбершэр* зрабілі спробу навукова-бібліяграфічнага агляду айчынных і замежных публікацый. У 1997 г. для бібліятэкі найноўшай гісторыі ў Штутгарце імі быў падрыхтаваны і выдадзены адначасова ў ЗША (г. Правідэнц) і Вялікабрытаніі (г. Оксвард) першы збор апублікаваных крыніц і літаратуры па тэме *«Вайна Гітлера на Усходзе: Крытычны агляд»* [1a] (тут і далей — пераклад аўтара. — **(С. Н.)**.

Выхад гэтай працы стаў значнай падзеяй у навуковым жыцці. Даследчыкі сабралі і тэматычна сістэматызавалі звыш 3200 найбольш значных выданняў з адзінаццаці краін свету: Вялікабрытаніі, ГДР, ЗША, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Францыі, ФРГ, Украіны і Беларусі. Сярод прац беларускіх аўтараў, напрыклад, нямецкімі вучонымі прыведзены даследаванні Г. І. Аляхновіч, А. І. Залескага, І. М. Ігнаценкі, І. С. Краўчанкі, В. П. Раманоўскага, А. А. Фактаровіча і інш. [2].

Архітэктоніку кнігі вызначаюць 5 раздзелаў: «Палітыка і стратэгія» (Р.-Д. Мюлер); «Ваенная кампанія» (Г. Р. Юбершэр); «Ідэалагічныя матывы вынішчальнай вайны на Усходзе» (Г. Р. Юбершэр); «Акупацыя» (Р. Д. Мюлер); «Вынікі вайны і яе гістарычныя ўрокі» (Р. Д. Мюлер, Г. Р. Юбершэр). Кожны з раздзелаў падпарадкаваны галоўнай ідэі агляду: пошуку навуковых і даследчыцкіх навацый. На думку аўтараў, сярод іх — распрацоўка альтэрнатыўных канцэпцый гісторыі вайны і акупацыі, выкарыстанне цэласнага і параўнаўча-гістарычнага падыходаў пры даследаванні асаблівасцей акупацыйнага рэжыму, пошук новых дакументальных крыніц і ўвядзенне іх у навуковы ўжытак і г.д. [3].

Непасрэднае дачыненне да тэмы акупацыйнага рэжыму ў Беларусі мае чацвёртая «Частка Д: «Акупацыя», у якой сабраны і навукова-бібліяграфічна апрацаваны 532 апублікаваныя працы. Першапачатковы агляд, праведзены Р.-Д. Мюлерам паводле назваў, формы і зместу асноўных публікацый і выкладзены ім ва ўступным слове да раздзела, дае беларускім чытачам і прафесійным даследчыкам добрую падставу для знаёмства з новымі тэндэнцыямі, якія зарадзіліся ў сусветнай і нямецкай гістарыяграфіі ў дачыненні да акупацыйнага рэжыму на занятай усходняй тэрыторыі. Спынімся толькі на некаторых, на наш погляд, ключавых момантах, якія згаданы ў выданні і маюць важнае значэнне для даследавання акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі.

Неабходна адразу адзначыць, што германскія навукоўцы Р. Д. Мюлер і Г. Р. Юбершэр асобую ўвагу звяртаюць на выданні, якія змяшчаюць нетрадыцыйныя ці альтэрнатыўныя канцэпцыі. Апошнія з'явіліся ў сучаснай германскай гістарыяграфіі як вынік пераадолення штучных абмежаванняў у выкарыстанні новых дакументальных крыніц і іх крытычнага аналізу. Такі напрамак доследу вызначаў сутнасна і змястоўна метадалогію падрыхтоўкі арыгінальных прац, аўтары якіх у 90-я гг. XX ст. мэтанакіравана вывучалі беларускую праблематыку ў рамках спецыяльных навуковых праектаў ці асабістых даследаванняў [4].

Разгляд тэмы акупацыі, як адзначаюць нямецкія даследчыкі, патрабуе выкарыстання розных навуковых сродкаў. Якраз складанасцю гістарычных з'яў, падзей, працэсаў у акупаванай Беларусі дэтэрмінавана дэталёвасць і паглыбленасць вывучэння іх асобных аспектаў, бакоў і характарыстык. Таму ў навуковым арсенале гісторыкаў трывала замацоўваецца дыферэнцыраваны падыход, з улікам якога вайна разглядаецца ў рамках агульнай навуковай канцэпцыі — *ваеннай гісторыі* альбо *гісторыі вайны*. Заўважым, што ў першым выпадку пры вызначэнні сутнасці «ваеннай гісторыі» прафесійныя даследчыкі традыцыйна зыходзілі з таго, што яна (ваенная гісторыя) з'яўляецца цэнтральнай праблемай гістарычнай навукі. Тэарэтычную аснову апошняй складала «класічная» канцэпцыя вайны, сутнасць якой на практыцы вызначалася наступнымі палажэн-

нямі: залежнасцю ваеннай палітыкі ад ваеннага кіраўніцтва; дзейнасцю ключавых ваенных суб'ектаў; ваенна-тэхнічнай характарыстыкай аперацый; вызначэннем гістарычнай ролі ваеннага кіраўніцтва [5]. У другім выпадку, гісторыя вайны як новая навуковая парадыгма не адразу стала спецыяльным раздзелам гістарычных даследаванняў. Толькі ў 90-я гг. XX ст. яна набыла сваю дакладна акрэсленую форму і адразу заняла вядучае месца ў германскай гістарыяграфіі, у якой навукоўцы пачалі мэтанакіравана кіравацца здабыткамі сусветнай гістарыяграфіі, шырэй уключаць у кола сваіх навуковых пошукаў пытанні будзённага жыцця, праблемы асабістага выжывання і выратавання цывільнага насельніцтва Беларусі ва ўмовах трохгадовага панавання акупацыйнага рэжыму [6].

Такім чынам, крытычны агляд, праведзены ў сваёй працы нямецкімі гісторыкамі Р. Д. Мюлерам і Г. Р. Юбершэрам, садзейнічае высвятленню адпаведнасці ваеннай праблематыкі сутнасці ваеннай гісторыі альбо гісторыі вайны [7]. Прычым развіццё згаданых тэарэтычных палажэнняў адбывалася з улікам выкарыстання вопыту прафесійных гісторыкаў, навуковых школ і даследчых цэнтраў. Як вынік — гісторыя акупацыі Беларусі ў распрацоўках нямецкіх вучоных палягае крыніцай новых навуковых пошукаў, знаходак, ацэнак.

У гэтай сувязі ўзнікае і другое метадалагічнае пытанне, якое праз бібліяграфічныя назвы знітоўвае практычна ўсе часткі згаданага выдання Р. Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра — аб суадносінах гістарычных і навуковых паняццяў «фашызм» і «нацызм». На погляд германскіх гісторыкаў, гэтае пытанне мае не тэрміналагічны, а канцэптуальны характар: *па-першае,* таму, што паняцце «фашызм», па характарыстыцы замежных і нямецкіх навукоўцаў, азначае нават у еўрапейскім маштабе канкрэтны факт існавання палітычнай, ваеннай, ідэалагічнай сістэмы італьянскага фашызму [8]; *па-другое,* праз канкрэтна-гістарычныя прычыны апошні патрапіў у гады другой сусветнай вайны пад уплыў германскага нацыянал-сацыялізму; *па-трэцяе,* прынцыповасць навуковых падыходаў да кожнага з іх канчаткова выяўлялася падчас адкрытых навуковых дыскусій і г. зв. агульнагерманскай «спрэчкі гісторыкаў» [9]. І ўрэшце рэшт, сучасная нямецкая гістарыяграфія кіруецца «залатым» правілам, што патрэбныя пры любым разглядзе маральныя і палітычныя меркаванні не могуць замяніць навукова-гістарычнага аналізу, ацэнак і заключэнняў. І таму, у адпаведнасці з гэтым правілам, «фашызм» разглядаецца як гістарычная з'ява канкрэтных краін Еўропы, а не толькі Германіі [10]. Тым не менш, у нямецкіх даследаваннях гэты тэрмін знаходзіў сваё адлюстраванне, аднак не ў абагульненай, а толькі ў канкрэтна-гістарычнай форме — «германскі фашызм» [11]. Якраз такія высновы знаходзяць пацвярджэнне сярод шматлікіх навуковых прац сучаснай германскай гістарыяграфіі [12], у якой аўтары прытрымліваюцца адзінай зыходнай пазіцыі: палітычны рэжым Германіі 1933—1945 гг. быў фактам існавання «нацысцкага рэжыму», «нацыянал-сацыялісцкай дыктатуры», «нацыянал-сацыялісцкай сістэмы» і г.д. [13]. Такім чынам, замацаванне ў сучаснай нямецкай гістарычнай навуцы новых поглядаў, падыходаў і ацэнак адбылося ў выніку ўсведамлення патрэбы ў тэрміналагічных зменах, якія абумоўлены ўзроўнем сучасных патрабаванняў да пытанняў гістарычнага мінулага.

З улікам гэтага беларускаму даследчыку нельга не звярнуць увагу яшчэ на

адзін метадалагічны аспект, які вынікае з вышэйзгаданага навукова-бібліяграфічнага збору і мае непасрэднае дачыненне не да аб'ектаў, а суб'ектаў акупацыйнай палітыкі ў Беларусі. Перш за ўсё — гэта дакладнае вызначэнне галоўных выканаўцаў безлічы палітычных, ваенных, эканамічных і іншых дырэктыў, загадаў, распараджэнняў вышэйшага ваеннага кіраўніцтва Трэцяга рэйху на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Асаблівасцю сучаснай нямецкай гістарыяграфіі з'яўляецца тое, што ў рэчышчы вырашэння навуковых задач даследчыкі ставяць вострае пытанне аб адказнасці тых, хто выконваў злачынныя загады Гітлера, вермахта, паліцыі і г.д. Вынікам напружанай працы як прафесійных гісторыкаў, так і палітолагаў, правазнаўцаў, сацыёлагаў і іншых спецыялістаў з'явілася адзіная думка: у гады акупацыі галоўнымі дзеючымі асобамі ў Беларусі былі не безыменныя выканаўцы, а самі *немцы* [14]. Германскія даследчыкі ўжываюць такое азначэнне на падставе дакументальных матэрыялаў, якія ўтрымліваюць бясспрэчныя доказы ўдзелу немцаў у ажыццяўленні не толькі ідэалагічных, палітычных, эканамічных, але і злачынных планаў нацысцкага кіраўніцтва Трэцяга рэйху на акупаванай тэрыторыі Беларусі [15].

Сёння, такім чынам, назіраецца адыход ад разгляду гісторыі акупацыі і другой сусветнай вайны праз прызму толькі «класічных» канцэпцый, тэрміналогіі, ацэнак. Замест іх сучасная заходняя гістарыяграфія прапануе альтэрнатыўныя ідэі, якія ў 80—90-я гг. XX ст. сталі асновай навуковых пошукаў і падмуркам новых гістарычных прац. Актуальнасць такога падыходу для беларускай гістарыяграфіі разглядаецца аўтарам данага артыкула як першачарговая задача ў сувязі з неабходнасцю пераадолення прынцыповых тэарэтычных і гістарычных разыходжанняў да праблематыкі другой сусветнай вайны і акупацыі Беларусі. Збліжэнне пазіцый часткова магчыма ў кантэксце правядзення айчыннымі гісторыкамі даследаванняў, пабудаваных па прынцыпе кампаратыўнага аналізу. У сувязі з такім падыходам беларускім навукоўцам важна разгледзець падзеі ваеннага мінулага праз прызму адпаведнасці (неадпаведнасці) з навуковымі высновамі нямецкіх калег, працы якіх змяшчаюць як альтэрнатыўныя падыходы, так і арыгінальныя гістарычныя крыніцы.

На заключэнне размовы ў межах навукова-бібліяграфічнага выдання Р. Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра неабходна спыніцца на вызначэнні канцэптуальнага характару самой вайны Гітлера на Усходзе. На думку нямецкіх аўтараў, вузлавыя ідэі вайны Гітлера супраць СССР упершыню навукова акрэсліваюцца амерыканскім даследчыкам *А. Даліным* у сярэдзіне 50-х гг. XX ст. [16] і з таго часу былі пакладзены ў якасці асноўнага падмурку заходняй гістарыяграфіі, а таксама з'яўляліся трывалай базай для даследчыкаў Германіі. Свой канчатковы выгляд канцэпцыя набывае больш чым праз тры дзесяцігоддзі, калі нямецкі гісторык *Вольфрам Ветэ* на мяжы 80—90-х гг. XX ст. прапанаваў вызначаць канцэптуальны характар «Вайны на Усходзе» з улікам сямі агульных аспектаў: *па-першае,* напад нямецкага вермахта на СССР разглядаецца як класічная форма агрэсіі; *па-другое,* вайна супраць Савецкага Саюза з'яўляецца фактам захопу «жыццёвай прасторы на Усходзе»; *па-трэцяе,* кіраўніцтва нямецкага Рэйху планавала вайну супраць СССР з мэтай палітычнага панавання, ідэалагічнага і расавага генацыду ў дачыненні да савецкага насельніцтва; *па-чацвёртае,* правядзенне

вайны на вынішчэнне было прадугледжана задоўга да нападу шляхам распрацоўкі злачынных загадаў і іх ажыццяўлення ў адносінах да камісараў і камуністычнай інтэлігенцыі; *па-пятае,* адной з састаўных частак расавай і ідэалагічнай вайны на вынішчэнне супраць Савецкага Саюза была ідэя масавага забойства савецкіх яўрэяў; *па-шостае,* асобных памераў набыло масавае забойства савецкіх ваеннапалонных; *па-сёмае,* вайна Гітлера на Усходзе была «жудаснай захопніцкай, прыгнятальніцкай і вынішчальнай вайной» [17].

Якраз у кантэксце новых канцэпцый, альтэрнатыўных падыходаў і крытычнага аналізу разглядаюць гісторыю акупацыі Беларусі (1941—1944 гг.) асобныя германскія даследчыкі. У цэнтры іх увагі пры гэтым знаходзяцца пытанні адзінства і асаблівасцей палітыкі акупацыі, ролі і функцыі мясцовай калабарацыі, месца і значэння супраціву, характару і формаў вынішчэння мясцовага насельніцтва і інш.

Адным з першых, хто ў 90-я гг. XX ст. пачаў спецыяльна займацца вывучэннем гісторыі акупацыйнага рэжыму на Беларусі, з'яўляецца нямецкі даследчык Бернгард К'яры, які ў сваёй працы на тэму *«Нямецкае грамадзянскае кіраўніцтва ў Беларусі 1941—1944. Работа акружных камісарыятаў з улікам асобага значэння сельскагаспадарчых кіраўнікоў»* [18] разглядае гісторыю акупацыі і прыходзіць да высновы, што ў генеральнай акрузе Беларусь «цэнтральнымі сферамі з'яўляліся: прапаганда, мясцовая інтэлігенцыя, цывільнае насельніцтва, новая аграрная рэформа» [19]. У дачыннені да апошняй сферы нямецкі аўтар адзначае вядучую ролю нямецкіх кіраўнікоў у галіне сельскагаспадарчай вытворчасці, дзе ў значнай меры праяўлялася акупацыйная палітыка нацыянал-сацыялісцкай Германіі [20]. Асаблівасці гэтай палітыкі ў дачыненні да асобных груп і прадстаўнікоў грамадзянскага насельніцтва вынікаюць з грунтоўнага разгляду яго нацыянальнага складу, які Б. К'яры праводзіць на аснове шматлікіх крыніц, знойдзеных у архівах Германіі (Берліна, Кобленца, Фрайбурга). Выкарыстанне ў кнізе дакументальных даных было для аўтара падмуркам для выяўлення этапаў фарміравання грамадзянскай адміністрацыі, яе асобных аддзелаў, перш за ўсё — сельскай гаспадаркі. Даследчыку ўдалося паказаць агульныя праблемы, з якімі сутыкнуліся прадстаўнікі ваеннага і грамадзянскага кіраўніцтва ў асобных акружных камісарыятах, а таксама генеральнай акрузе Беларусь у гады акупацыі [21].

Сваю працу, распачатую ў 1991 г. у межах вузкай тэмы, Б. К'яры працягнуў у рэчышчы комплекснага даследавання не менш актуальных праблем «акупацыі, калабарацыі і супраціву ў Беларусі». Навуковая праца выйшла ў 1998 г. пад назвай *«Будні па-за фронтам. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі 1941—1944»* [22]. Характэрнай адметнасцю даследавання можна лічыць зварот нямецкага вучонага да тэмы будзённага жыцця беларускіх людзей на акупаванай тэрыторыі. Аўтарскі напрамак быў вызначаны новай канцэптуальнай парадыгмай, сутнасць якой вынікала з тэарэтычных падыходаў сучаснай германскай гістарыяграфіі да ваеннай гісторыі і гісторыі вайны. Дзеля раскрыцця сацыяльных пытанняў у генеральнай акрузе Беларусь даследчык звяртаецца да вывучэння розных жыццёвых сфер, дзе панавалі нянавісць, падман, шантаж, прымус, здзекі, жах і шмат іншага, што вяло да «разбурэння грамадства, ліквідацыі яго сацыяльных рысаў» [23].

Грунтоўны аналіз праблем, якія ўзнімаюцца ў працы германскага гісторыка, цяжка зрабіць у межах артыкула. Таму звернемся да найбольш істотных момантаў навуковага пошуку, які даследчык прапануе з вызначэння ролі «немцаў у генеральнай акрузе Беларусь» і разглядае іх як галоўных дзеючых асоб, непасрэдных выканаўцаў гітлераўскай «усходняй палітыкі» [24]. Як адчувалі сябе многія з немцаў у гэтай новай рэчаіснасці на беларускай зямлі? Пра яе яны практычна нічога не ведалі і таму не маглі самастойна «арыентавацца», хаця слепа верылі ў сваю «гістарычную місію».

Сітуацыя яшчэ больш ускладнялася ў сувязі з тым, што былі створаны мясцовыя паліцэйскія фарміраванні, якія таксама шырока прымянялі насілле. Даследчык лічыць, што стварэнне і выкарыстанне мясцовых паліцэйскіх было «палітычна непажаданым» і з'яўлялася хутчэй рэакцыяй на недахоп германскіх паліцэйскіх на акупаванай тэрыторыі. У адпаведнасці з дырэктывамі аб паліцэйскім забеспячэнні органаў грамадзянскага кіравання на занятых усходніх тэрыторыях кіраўніцтва СС планавала стварыць сетку апорных пунктаў з асобных часцей і паліцыі, якія б ажыццяўлялі кантроль на тэрыторыі генеральнай акругі. Апрача таго, яны павінны былі выконваць функцыю «анямечвання» усходніх тэрыторый. Нямецкія і мясцовыя паліцэйскія сілы былі звяном у ланцугу акупацыйнага рэжыму [25].

Да ліку асобных аб'ектаў і суб'ектаў нямецкай акупацыйнай палітыкі Б. К'яры далучае беларускіх дзяцей, у якіх вайной было «ўкрадзена дзяцінства». Дзеці і падлеткі ў параўнанні з дарослымі былі безабароннымі перад хаосам, злачыннымі дзеяннямі адміністрацыі, некампетэнтнасцю і тэрорам. Увогуле лёсы беларускіх «дзяцей вайны» не падлягаюць колькаснаму вымярэнню. Некаторая частка падрастаючага пакалення трапіла «ў рукі новага рэжыму», стала на шлях супрацоўніцтва з акупацыйнай уладай.

Значную ўвагу даследчык надае гісторыі вынішчэння беларускіх яўрэяў. З прыведзеных даных вынікае, што з 820 000 яўрэйскага насельніцтва Беларусі перажыць другую сусветную вайну ўдалося толькі 120—150 тысячам [26]. На думку нямецкага аўтара, сёння цяжка правесці поўны аналіз геаграфіі генацыду супраць яўрэйскага насельніцтва, суаднесці колькасна, параўнаць змястоўна. Сярод прычын, якія аб'ектыўна перашкаджаюць гэтаму, — частковая «адсутнасць дакументальных крыніц».

Відавочна, што работы Б. К'яры — прынцыпова новыя даследаванні, якія даюць магчымасць не толькі пазнаёміцца з самастойным аўтарскім пошукам, але і садзейнічаюць асвятленню найбольш складаных старонак гісторыі вайны.

У адпаведнасці з поглядамі другога германскага гісторыка — *Хартмута Ленгарда,* аўтара кнігі *«Жыццёвая прастора на Усходзе». Немцы ў Беларусі 1941—1944»,* якая выйшла ў 1991 г. у Дзюсельдорфе, перыяд нямецкай акупацыі Беларусі неабходна разглядаць толькі ў кантэксце новых навуковых падыходаў, г. зн. у першую чаргу звяртаць увагу на падзеі будзённага жыцця беларускага насельніцтва ва ўмовах панавання акупацыйнага рэжыму [27]. Гісторыя вайны паказана даследчыкам у адлюстраванні дакументальных крыніц і арыгінальных навуковых матэрыялаў, якія пераконваюць чытача ў тым, што непасрэднымі стваральнікамі «жыццёвай прасторы на Усходзе» былі не столькі аку-

пацыйная ваенная і цывільная адміністрацыі, акружныя і раённыя, мясцовыя органы кіравання, колькі прадстаўнікі нямецкай нацыі — немцы. Яны з'яўляліся адначасова як арганізатарамі, выканаўцамі, стваральнікамі, так і захопнікамі, разбуральнікамі, рабаўнікамі і ўрэшце — забойцамі [28]. Заслуга германскага даследчыка ў тым, што ён у сваёй кнізе ўдала выкарыстаў канкрэтна-гістарычны падыход і прапанаваў чытачу самастойна зазірнуць у вытрымкі з арыгінальных дакументаў, без купюр пераканацца ў фактычным развіцці супярэчлівых падзей і працэсаў у акупаванай Беларусі, асобных гарадах: Мінску, Баранавічах, Барысаве, Глыбокім, Слуцку і інш. [29]. Каштоўнасць выдання заключаецца таксама ў тым, што яно ахоплівае шэраг вузлавых пытанняў перыяду акупацыі Беларусі (напрыклад: структуры акупацыйнай улады; сутнасці захопніцкай палітыкі і палітыкі вынішчэння мірнага насельніцтва; злачынных забойстваў ваеннапалонных і яўрэяў; старонак барацьбы партызан і падпольшчыкаў і г. д.), над чым і сёння прадаўжаюць працаваць беларускія даследчыкі.

Да іх ліку можна аднесці і нацыянал-сацыялісцкую палітыку генацыду на тэрыторыі Беларусі. Гэтай тэме было прысвечана спецыяльнае выданне *«Выкарыстана ў «Рэйхскамісарыяце Остланд»: Дакументы па генацыдзе ў краінах Прыбалтыкі і Беларусі 1941—1944»,* якое выйшла ў 1998 г. у серыі «Нацыянал-сацыялісцкая акупацыйная палітыка ў Еўропе 1939—1945» [30]. Навуковы праект быў здзейснены пад кіраўніцтвам *Вольфганга Бенца* ў Цэнтры даследаванняў Берлінскага тэхнічнага універсітэта. Выканаўцы — германскія даследчыкі мелі на ўвазе дзве асноўныя мэты: *па-першае,* ліквідаваць навуковы і грамадскі дэфіцыт ведаў па згаданай праблеме, а *па-другое,* надаць ёй сапраўдны «еўрапейскі» характар шляхам пераадолення панаваўшых дагэтуль нацыянальных абмежаванняў.

Адметнасць кнігі палягае ў тым, што яна пабудавана выключна на дакументальных матэрыялах, знойдзеных у архівах розных краінаў свету, у тым ліку Беларусі (Брэст, Мінск), Літвы (Вільнюс), Латвіі (Рыга), Расіі (Масква), а таксама Германіі (Фрайбург, Бон, Лудвігсбург), Ізраіля (Ерусалім), ЗША (Вашынгтон) і інш. — разам 263 архіўныя дакументы. Амаль трэцяя частка ўсіх сабраных у кнізе дакументаў — з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Брэсцкага абласнога архіва.

Увесь матэрыял тэматычна падзелены на 5 частак, у якіх аўтары на падставе дакументаў паказалі праграму падрыхтоўкі ваеннай аперацыі на Усходзе і базавыя дырэктыўныя матэрыялы па яе ажыццяўленні; першую хвалю забойстваў на акупаванай тэрыторыі Прыбалтыкі і Беларусі; геаграфію створанай сістэмы гета на тэрыторыі рэйсхкамісарыята Остланд; другой хвалі забойстваў на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь; факты знаходжання яўрэйскага насельніцтва ў канцэнтрацыйных лагерах. Завяршае працу бібліяграфія, куды ўваходзяць надрукаваныя зборы крыніц і дакументаў, значныя публікацыі па тэме, а таксама дзённікі, мемуары і г. д. [31].

Такім чынам, нават кароткі агляд выдання дазваляе беларускім даследчыкам уявіць, што ў навуковы ўжытак уводзіцца значны корпус арыгінальных крыніц па гісторыі другой сусветнай вайны, якія ў айчыннай гістарыяграфіі можна выкарыстаць для запаўнення прабелаў у даследаванні акупацыйнай палітыкі нацысцкай Германіі ў Беларусі.

Арыгінальную трактоўку акупацыйнага рэжыму прапануе берлінскі даследчык *Крысціян Герлах* — аўтар выдання *«Зкалькуляваныя забойствы. Нямецкая эканамічная палітыка і палітыка вынішчэння ў Беларусі з 1941 па 1944»* [32]. Значнасць кнігі вынікае таксама, *па-першае,* з цэласнага (сістэмнага) паказу нацысцкай акупацыйнай палітыкі Германіі на тэрыторыі Беларусі; *па-другое,* канкрэтна-гістарычнага аналізу дзейнасці аб'ектаў і суб'ектаў нямецкага акупацыйнага рэжыму; *па-трэцяе,* кампаратыўнага падыходу пры даследаванні гісторыі акупацыі ў Беларусі. І ўрэшце, выкарыстання альтэрнатыўных падыходаў, вялікага кола архіўных крыніц і замежнай літаратуры пры ацэнцы супярэчлівых гістарычных падзей у Беларусі.

Даследчыкам праведзены падрабязны аналіз прычын, мэтаў і задач захопніцкай палітыкі, што дазволіла зрабіць выснову аб непасрэднай іх сувязі з ваеннымі, эканамічнымі і палітычнымі дзеяннямі розных германскіх акупацыйных структур [33]. Абапіраючыся на шматлікія архіўныя крыніцы (з 21 архіўнай установы краін свету), нямецкі даследчык сцвярджае, што *паміж эканамічнымі інтарэсамі і зкалькуляванымі забойствамі існуе прамая сувязь* [34] (выдзелена і падкрэслена мной. — **С. Н.**).

У даследаванні адзначана, што нямецкія захопніцкія планы не абмінулі Беларусь. Яе будучыня разглядалася на самым высокім узроўні, дзе вырашылі, што яна павінна стаць спецыяльным палігонам для ваенных, эканамічных і вынішчальных эксперыментаў, пераўтварыцца ў зону перасялення еўрапейскіх яўрэяў. Планы па «мадэрнізацыі» тэрыторыі прадугледжвалі замену яе карэннага насельніцтва прадстаўнікамі іншых народаў, у першую чаргу — нямецкімі перасяленцамі.

Структура і функцыі акупацыйнага кіравання разглядаюцца К. Герлахам у непасрэднай сувязі з ваеннымі падзеямі. У даследаванні асобная ўвага звернута на вобласць ваеннага кіравання, якая, *па-першае,* складала амаль палову перадваеннай тэрыторыі Беларусі, а *па-другое,* у сувязі з недастатковай навуковай распрацаванасцю. Як адзначае нямецкі гісторык, у рамках дзейнасці ваеннай адміністрацыі вырашальную ролю выконвалі розныя ваенна-эканамічныя органы. На дакументальным матэрыяле наглядна паказаны функцыі эканамічнай інспекцыі як надзейнага «філіяла чатырохгадовага плана Трэцяга рэйху» [35]. Непасрэднымі выканаўцамі планаў эканамічнага рабавання з'яўляліся эканамічныя каманды, спецыяльныя групы па сельскай гаспадарцы, прамысловасці, рамеснай вытворчасці і інш. Праграма іх дзеянняў дакладна вызначалася патрэбай фронта, аднак і ў тылавой зоне вышэйшым камандаваннем вермахта былі запраграмаваны злачынныя сродкі і формы выканання эканамічных планаў.

Даследчык аналізуе факты супрацоўніцтва насельніцтва з акупантамі. Прыкладам палітычнай калабарацыі з'яўляліся створаныя ў межах генеральнай акругі Беларусь розныя арганізацыі. Разгляд іх дзейнасці прывёў К. Герлаха да высновы, што палітычная калабарацыя мела значна меншы поспех у параўнанні з тым, чаго дасягнулі немцы ў выкарыстанні сваіх беларускіх памагатых у мясцовых паліцэйскіх фарміраваннях, органах агульнага і мясцовага, асабліва сельскагаспадарчага, кіравання і г.д. Як адзначае даследчык, нават без уліку палітычнай калабарацыі ў распараджэнні немцаў знаходзіўся больш чым 150-ты-

сячны корпус тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі [36]. На тэрыторыі Беларусі была створана сістэма жорсткага кантролю за кожным гарадскім і сельскім жыхаром.

Германскі аўтар разглядае сістэму арганізацыі вывазу мірнага насельніцтва, паказвае асноўныя метады дзейнасці спецыяльных устаноў, формы прымусу з боку розных органаў цывільнай і ваеннай адміністрацыі і г.д. Выкарыстанне рабочай сілы на тэрыторыі Беларусі было галоўнай задачай канкрэтных служ-баў, якія «клапаціліся» не толькі аб фарміраванні спецыяльных працоўных падраздзяленняў з беларускага насельніцтва, але і іх пастаянным папаўненні прадстаўнікамі горада і вёскі. Створаную нацыстамі сістэму К. Герлах разглядае з першых масавых забойстваў як метад селекцыі і генацыду ў дачыненні да мясцовага насельніцтва. Апрача таго, германскі даследчык канстатуе, што свой пачатак масавыя забойствы бяруць у чэрвені-ліпені 1941 г. Рубяжом, калі пачалося суцэльнае вынішчэнне беларускіх яўрэяў, навукоўца лічыць канец лета і пачатак восені. Акцыі супраць яўрэйскага насельніцтва праводзілі спецыяльныя групы, часці СС, вайсковыя і паліцэйскія фарміраванні. Ліквідацыя вялікіх яўрэйскіх абшчын ва ўсходняй частцы Беларусі была запланавана з верасня па снежань 1941 г. У гэты ж час адбылося масавае вынішчэнне яўрэяў у генеральнай акрузе Беларусь. Правядзенне шырокамаштабнай акцыі па вынішчэнні яўрэйскага насельніцтва заняло звыш года і было завершана на тэрыторыі Беларусі да лета 1943 г. Па падліках К. Герлаха, германскія акупанты вынішчылі на Беларусі каля 500 тыс. мясцовых яўрэяў [37].

У даследаванні асвятляецца дэпартацыя яўрэяў з іншых краін Еўропы ў Беларусь, на прыкладзе апошняй прыведзены дакладныя лічбавыя даныя, геаграфія забойстваў і г.д. Не абыходзіць аўтар і такое пытанне, як практыка і метады забойстваў, дзе спыняецца на прыкладах дзейнасці спецыяльных падраздзяленняў, выкарыстанні імі самых розных сродкаў для забойстваў, у тым ліку газавых камер.

Значнае месца ў працы адведзена асэнсаванню фактаў злачынных адносін да савецкіх ваеннапалонных, якія былі пазбаўлены ўсяго, нават вады і харчавання. Смяротнасць ваеннапалонных ад голаду дасягнула масавага характару ў першую восень вайны на Усходзе. Апрача стварэння нечалавечых умоў існавання ў лагерах германскія карныя органы праводзілі і публічныя расстрэлы, асабліва палітычных і «расавых» ворагаў, якіх мэтанакіравана выяўлялі сярод ваеннапалонных. Агульная ж лічба савецкіх ваеннапалонных, якія, па падліках нямецкага даследчыка К. Герлаха, загінулі на беларускай зямлі, не пераўзыходзіць 700 тыс. чалавек [38].

Апрача таго, прыведзеныя К. Герлахам фактычныя матэрыялы сведчаць, што масавае знішчэнне ваеннапалонных шляхам голаду адпавядала дакладнаму *плану*, у адпаведнасці з якім адначасова ажыццяўляліся мерапрыемствы па масавым вынішчэнні беларускіх яўрэяў. Такім шляхам вырашалася праблема забеспячэння харчаваннем вермахта і нямецкага насельніцтва ў рэйху. Першая стадыя гэтага плана, як паказвае даследчык, была рэалізавана ў верасні 1941 г. Наступныя стадыі ўзнікалі якраз у сувязі з абвастрэннем сітуацыі на «харчовым фронце» ўзімку 1941/42, летам 1942 гг. і г.д. [39].

Разгляд тэрору супраць насельніцтва Беларусі прыводзіць аўтара да заключэння аб наяўнасці *сістэмы* злачыннага вынішчэння людзей. Аналіз сродкаў, формаў і метадаў тэрору і забойстваў даў навукоўцу падставу для вызначэння тактычных, стратэгічных і арганізацыйных аспектаў такой сістэмы. Берлінскі гісторык заключае, што яе ўсебаковае даследаванне патрэбна дзеля таго, каб «зразумець неспасціжнасць трагедыі беларускага народа» [40].

Такім чынам, зварот да сучаснай германскай гістарыяграфіі, на наш погляд, пераканаўча сведчыць аб зацікаўленасці нямецкіх навукоўцаў у аб'ектыўным вывучэнні гісторыі другой сусветнай вайны і акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. У шэрагу замежных навуковых, навукова-бібліяграфічных і дакументальных выданняў markednабакова асветлены гістарычныя падзеі, прыведзены шматлікія фактычныя матэрыялы, зроблены абгрунтаваныя высновы, якія ўзбагачаюць і айчынную гістарыяграфію.

У прафесійных гісторыкаў нашай краіны сёння ёсць не толькі магчымасці для знаёмства з новымі выданнямі, але і аб'ектыўныя падставы да збліжэння навуковых пазіцый, стварэння сумесных аўтарскіх калектываў і напісання прац па праблемах гісторыі акупацыйнага рэжыму ў Беларусі 1941—1944 гг.

---

1. Hamburger Institut fuer Sozialforschung; Militaergeschichtliches Forschungsamt zu Potsdam; Zentrum fuer Antisemitismusforschung an Technischer Universitaet Berlin u.a.; Bernhard Chiari. Deutsche Zivilverwaltung in Weissrussland 1941—1944. Die Arbeit der Gebietskommissariate unter besonderer Beruecksichtigung der Landwirtschftsfuehrer. Frankfurt a.M., 1991. 132 S; Ён жа. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941—1944. Duesseldorf, 1998. — 380 S; Gerlach Christian. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000. 1232 S; Lenhard Hartmut. «Lebensraum im Osten»: Deutsche in Belorussland 1941—1944. Duesseldorf, 1991. 312 S; Rolf Michaelis. Das SS-Sonderkommando Dirlewanger: ein Beispiel deutscher Besartungspolitik in Weissrussland. Berlin, 1998. 217 S. usw.

1a. Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R. Hitler's war in the East, 1941—1945: a critical assessment. Providence / Oxford, 1997. — 405 S; Іх жа: Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. Wissenschaftliche Buchgesellschaft. Darmstadt, 2000. — 451 S.

2. Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R. Hitler's war in the East..., S. 323, 330, 331 usw.; Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht..., S. 348, 359—361, 365, 371 u.a.

3. Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht..., S. VIII—XII.

4. Einsatz im «Reichskommissariat Ostland»: Dokumente zum Voelkermord im Baltikum und in Weissrussland 1941—1944 / hrsg. von Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Juergen Matthaeus. Berlin: Metropol, 1998. — 301 S; Bernhard Chiari. Deutsche Zivilverwaltung in Weissrussland...; Ён жа. Alltag hinter der Front...; Lenhard Hartmut. «Lebensraum im Osten»...; Gerlach Christian. Kalkulierte Morde... .

5. Der Krieg des kleinen Mannes. Eine Militaergeschichte von unten. Hrsg. von Wolfram Wette. Muenchen / Zuerich, 1992. S. 9.

6. Гл. падрабязна: Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R. Hitler's war in the East..., S. 297—311; Lenhard Hartmut. «Lebensraum im Osten»..., S. 5—6; Chiari Bernhard. Alltag hinter der Front..., S. 10—13; Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 33—34.

7. Гл. напрыклад: Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4: Der Angriff auf die Sowjtunion / Hrsg. vom Militaergeschichtl. Forschungsamt. — 2, unveraend. Aufl. Stuttgart,

1987. — 1172 S.; Der Zweite Weltkrieg: Analysen. Grundzuege. Forschungsbilanz / Hrsg. von Wolfgang Michalka. Weyarn, 1997. 873 S.

8. Гл. напрыклад: Zeev Sternhell, Mario Sznajder, Maria Asheri. Die Entstehung der faschistischen Ideologie. Von Sorel zu Mussolini. Hamburg, 1999. 411 S.

9. Гл. падрабязна: «Historikerstreit»: Die Dokumentation der Kontroverse um die Einzigartigkeit der nationalsotialistischen Judenvernichtung. Muenchen / Zuerich, 1987. 397 S.

10. Enzyklopaedie des Nationalsoyialismus. Hrsg. von Wolfgang Benz, Hermann Graml und Hermann Weiss. Stuttgart, 1998. S. 453—457, 599—600; Das grosse Lexikon des Dritten Reiches. Suedwest Verlag, Augsburg, 1993. S. 170—171, 403—409; Manfred G. Schmidt. Woerterbuch zur Politik. Stuttgart, 1995. S. 296—298, 638—640.

11. «Historikerstreit»: Die Dokumentation der Kontroverse um die Einzigartigkeit der nationalsotialistischen Judenvernichtung..., S. 324; Ulrich von Hehl: Nationalsozialistische Herrschaft // Enzyklopaedie deutscher Geschichte. Bd. 39. Muenchen: Oldenboeurg, 1996. S. 56.

12. Гл.: Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht..., S. 339—373.

13. Гл. напрыклад: Reihe «Natinalsozialistische Besatzungspolitik in Europa 1939 — 1945». Hrsg. von Wolfgang Benz, Johaness Houwink, Gerhagd Otto. Berlin, 1996 — 1999; Solidaritaet und Hilfe fuer Juden waehrend der NS-Zeit. Berlin, 1999. Ulrich von Hehl: Nationalsozialistische Herrschaft // Enzyklopaedie deutscher Geschichte. Bd. 39. Muenchen: Oldenboeurg, 1996; Nationalsozialistische Vernichtungspolitik 1939—1945. Hrsg. von Ulrich Herbert. Frankfurt a.M., 1998; Der Nationalsozialismus vor Gericht. Hrsg. von Gerd. R. Ueberschaer. Frankfurt a.M., 1999 usw.

14. Lenhard Hartmut. «Lebensraum im Osten»: Deutsche in Belorussland 1941—1944. Duesseldorf, 1991.

15. Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944. Hamburg, 1995. — 697 S; Die Wehrmacht. Mythos und Realitaet. Hrsg. von Rolf-Dieter Mueller und Hans-Erich Volkmann. Muenchen: Oldenbourg, 1999. — 1318 S; Hannes Heer. Tote Zonen. Die deutsche Wehrmacht an der Ostfront. Hamburg, 1999. — 327 S.

16. Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht..., S. 321.

17. Wette Wolfram. Sowjetische Erinnerungen an den deutschen Vernichtungskrieg, in: «Ich wundere mich, dass ich noch lebe»: sowjetische Augenzeugen berichten / Paul Kohl. Guetersloh, 1990. S. 296—300.

18. Bernhard Chiari. Deutsche Zivilverwaltung in Weissrussland 1941—1944. Die Arbeit der Gebiets-kommissariate unter besonderer Beruecksichtigung der Landwirtschaftsfuehrer. Frankfurt a.M., 1991. — 132 S.

19. Тамсама. S. 93.

20. Тамсама. S. 4.

21. Тамсама. S. 26, 42, 61 і інш.

22. Chiari Bernhard. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941 — 1944. Duesseldorf, 1998. — 380 S.

23. Тамсама. S. 6.

24. Тамсама. S. 51—95.

25. Тамсама. S. 194.

26. Тамсама. S. 231.

27. Lenhard Hartmut. «Lebensraum im Osten»: Deutsche in Belorussland 1941—1944..., S. 8.

28. Тамсама. S. 77, 155, 173, 199, 247, 277 usw.

29. Гл. тамсама. S. 33—298.

30. Einsatz im «Reichskommissariat Ostland»: Dokumente zum Voelkermord im Baltikum und in Weissrussland 1941 — 1944 / hrsg. von Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Juergen Matthaeus. Berlin: Metropol, 1998. 301 S.

31. Гл. падрабязна: Беларускі гістарычны агляд. Том 6, Сшытак 1—2 (10—11), Снежань 1999. С. 346—349.

32. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

33. Гл. падрабязна. S. 36 — 127.

34. Тамсама. S. 1143.

35. Гл. падрабязна: S. 146—150.

36. Тамсама. S. 209.

37. Тамсама. S. 743.

38. Тамсама. S. 857.

39. Гл. падрабязна: S. 823 — 834.

40. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 1161.